УДК 378.1

М. К. Якаўлеў, дацэнт

# СПАДЧЫНА СКАРЫНЫ І ІДЭЙНА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ-ТЭХНОЛАГАЎ ПАЛІГРАФІЧНАЕ ВЫТВОРЧАСЦІ

Ways and forms of university students of printing production patronic upbrinding using the legacy of the great Belarusian enlightener F. Skaryna are discussing.

Ідэйна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў належыць да прыярытэтных кірункаў ідэалагічнай працы ў ВНУ. У былым СССР выхаванне савецкага патрыятызму грунтавалася на класавым падыходзе і марксізме-ленінізме, спалучаных з так званым пралетарскім інтэрнацыяналізмам. Між тым яшчэ К. Дз. Ушынскі пісаў, што «толькі тое выхаванне добраахвотнае, якое абапіраецца на нацыянальныя карані». Выхаванне моладзі, у тым ліку студэнтаў ВНУ любой самастойнай краіны, грунтуецца на лепшых традыцыях сваёй культуры. Менавіта яна, інтэгруючы агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці, складае тое духоўнае апірышча, якое дазваляе народу асэнсаваць сваё існаванне і выйсці на гістарычную арэну.

Ідэйна-патрыятычнае выхаванне ў нашай краіне мае трывалы фундамент. За тысячагадовую гісторыю беларускі народ стварыў найбагацейшую культуру высокага еўрапейскага ўзроўню і непаўторнае мастацтва. Вызначальнай рысай нашай культуры ёсць гуманізм, які сфарміраваўся ў выніку сінтэзу старажытнабеларускіх і заходнееўрапейскіх традыцый, на ідэйна-мастацкай спадчыне Кірылы і Мяфодзія, гуманістычных і асветніцкіх поглядах Кірылы Тураўскага і Еўфрасінні Полацкай, нашым старажытным кульце ведаў і інш.

Выхаваўчай працай, і ў тым ліку ідэйна-патрыятычным выхаваннем, павінны займацца ўсе кафедры універсітэта, а не толькі так званыя грамадазнаўчыя, бо культура тычыцца ўсіх: у ёй мы жывём. У гэтым сэнсе факультэт выдавецкай справы і паліграфіі валодае выключнымі магчымасцямі: у нас ёсць вялікі Скарына.

Пра дзейнасць і спадчыну нашага нацыянальнага генія, які стаў найбольш яркім прадстаўніком гуманістычнай традыцыі нашай культуры ў эпоху Адраджэння, напісаны шматлікія артыкулы і тамы. Тут адзначым толькі, што Скарына — наш першы паліграфіст, кнігавыдавец і дызайнер. Ён першым у кірылічным друку ўжыў тытульны ліст. Ілюстрацыі ў скарынавых выданнях служаць мастацкім сродкам для раскрыцця зместу і ўражваюць не толькі незвычайна вялікай колькасцю, але і дасканаласцю тэхнікі, арыгінальнасцю і глыбокім псіхалагізмам. Ён значна палепшыў зрокавае ўспрыманне тэксту, увёўшы абзацы і прагалы паміж словамі. Гарнітура скарынавых выданняў служыць выдатным помнікам кірылічнага друку, а выкарыстанне кінавары — удалым узорам аздобы тэкстаў. Кнігі Скарыны яскрава сведчаць, што беларускае кнігадрукаванне пачалося адразу з высокага еўрапейскага ўзроўню. «Глосы» на палях скарынавых выданняў былі першымі перакладнымі слоўнікамі, а выявай Скарыны ў пражскім выданні «Ісус Сірахаў» (1517 г.), калі ўпершыню на старонках Бібліі з'явіўся партрэт свецкага чалавека, распачаўся рэнесансавы кірунак у развіцці беларускага жывапісу.

Жыццёвы подзвіг Скарыны не толькі ў тым, што ён першым надрукаваў кірылічную «Біблію». Скарына — гарачы патрыёт, што найбольш пераканальна выказаў у вядомых словах прадмовы да кнігі «Юдыф»: «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, знають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, и где зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають. Про то ж и сия вдовица Июдиф для места рожения своего выдала ест живот свой на небезопеченство. Но Господь Бог для доброго умыслу ся помог ей, яко непобедимого от людей победила».

З гэтых пранікнёных словаў вынікаюць відавочныя высновы, што чалавек, які не любіць Радзіму, ніжэйшы за жывёлаў, а патрыятызм — гэта ўсведамленне вялікай вартасці нацыянальнай культуры і неабходнасці працы на яе карысць. Але ж Скарына не толькі па-мастацку прыгожа сказаў пра любоў да Бацькаўшчыны, а засведчыў свой патрыятызм працай на карысць «люду паспалітаму», г. зн. народу. Яго патрыятызм — у дзейна-вартаснай форме засваення быцця, якая з'яўляецца канкрэтызацыяй «паспалітага добрага», г. зн. агульнага дабра, што Скарына ўвёў у нашу філасофію.

Выхаванне ў студэнтаў і моладзі любові да Бацькаўшчыны ў моладзі — складаная і шматгранная задача. Маладое пакаленне найчасцей не ўспрымае навучанні і спробы навязаць ім чужыя рашэнні або ідэі. Прычына ў тым, што яны дасягнулі пэўнага ўзросту, калі пачынаюць адчуваць сябе асобай, індывідуальнасцю. Гэта натуральная і станоўчая з'ява. Маладыя людзі будуць карыстацца пэўнымі ідэямі, калі яны стануць іх асабістымі ідэямі [1]. І гэта тычыцца любых сфераў выхавання, а не толькі патрыятызму. Для гэтага ва універсітэце павінна быць створана сістэма патрыятычнага выхавання, а выкладчыкі, куратары і пажадана бацькі павін-

ны дасканала валодаць прыёмамі і формамі выхаваўчай працы.

Асоба Скарыны мае неаспрэчную вялікую каштоўнасць для ідэйна-патрыятычнага выхавання моладзі, студэнтаў ВНУ і найперш выдаўцоў і паліграфістаў. Па-першае, гэта прызнаюць усе незалежна ад палітычных перакананняў, веравызнання і інш., што стварае магчымасць для кансалідацыі грамадства. Не будзе перабольшаннем адзначыць, што само існаванне культурнага феномена Скарыны паспрыяла адкрыццю ў нашай краіне падрыхтоўкі паліграфістаў і выдаўцоў з універсітэцкай адукацыяй.

Па-другое, у краіне створана разнастайная мастацкая і літаратурная Скарыніяна. Напісаны мастацкія творы і карціны, выдадзены энцыклапедычны даведнік, тэксты і альбом гравюраў Скарыны, класічныя творы М. Шчакаціхіна, працы Г. Галенчанкі, А. Каўкі, В. Шматава і інш. Імя Скарыны носяць універсітэт, бібліятэкі. Такім чынам, тэма Скарыны шырока распрацавана, і неабходных матэрыялаў дастаткова.

Аднак нават студэнты-тэхнолагі паліграфічнай вытворчасці вельмі мала ведаюць пра свайго вялікага папярэдніка. Так, на пытанне, калі Скарына надрукаваў першую кнігу, сярод студэнтаў 3 курса правільны адказ пра год выдання быў 1, а дакладнай даты (6 жніўня 1517 г.) не ведаў ніхто! І гэта не выпадкова. Імя Скарыны студэнтам сустракаецца ў курсах беларускай мовы, гісторыі Беларусі і філасофіі на першым і другім курсах універсітэта, а далей не згадваецца зусім. Не шмат для краіны, якую Скарына зрабіў радзімай усходнеславянскага кнігадрукавання! Вельмі рэдка можна ўбачыць у нас і выявы першадрукара. У друкарнях, дзе працуюць нашыя выпускнікі, на працоўных месцах і вытворчых участках таксама амаль не сустрэць выяваў Скарыны, хаця на тых, што даводзілася наведаць, часам можна сустрэць партрэты, напрыклад Рэрыха (!). Гэта сведчыць пра пэўную светапоглядную дэзарыентацыю грамадства і стварае глебу для розных рэлігійных, культурніцкіх і іншых сектаў, глыбока чужародных для нашай культурнай традыцыі. Канешне, павесіць партрэт — гэта самае простае, але ж вядома, якую важную ролю адыгрывае ў выхаванні наогул, і, у прыватнасці патрыятызму, візуальнае і тапанімічнае асяроддзе.

Дададзім таксама, што тыя невялікія тэксты, якія студэнтам-тэхнолагам паліграфічнай вытворчасці трэба пісаць самастойна, прыкладам уступ і заключэнне ў курсавых праектах, выклікаюць звычайна большыя цяжкасці, чым самі разлікі. Такія тэксты атрымліваюцца найчасцей прымітыўнымі лексічна і ўбогімі стылёва, а таксама маюць шмат граматычных і арфаграфічных памылак. Здаецца, хто ж павінен пісаць дасканала, калі не студэнты універсітэтаў, якія, як вядома, рыхтуюць эліту? Прычына у тым, што для большасці нашых студэнтаў мова выкладання не ёсць роднай, і ў выніку інтэрферэнцыі блізкіх моваў большасць выпускнікоў з універсітэцкімі дыпломамі не валодае ніякай мовай, не кажучы ўжо пра замежныя. Таму дастаткова добра валодаючы прафесіяй, яны маюць невысокі культурны ўзровень.

Каб студэнты-паліграфісты і выдаўцы ведалі пра Скарыну, ганарыліся ім і хацелі быць падобнымі на яго, трэба ўключыць у праграмы спецыяльных дысцыплін матэрыялы пра дзейнасць Скарыны, вывучаць тэксты яго прадмоў і пасляслоўеў, разглядаць паліграфічныя асаблівасці яго выданняў і г. д. Для студэнтаў-паліграфістаў і выдаўцоў гэта не проста карысна, але натуральна і арганічна. Але гэтага мала.

Вядома, якія магутныя сродкі ўздзеяння на людзей маюць мастацтва, музыка, паэзія. Мастацтва — гэта, па сутнасці, перадача эмоцый, а ў маладым узросце назіраецца пераважна эмацыянальнае разуменне быцця. Таму ў выхаванні выдатна спрацоўваюць сучасныя формы прафесійнай і масавай культуры, прыкладам, бардаўскія песні, вершы, кінасерыялы, дэтэктывы, коміксы і інш. Як тут не прыгадаць Максіма Ісаева, героя тэлесерыяла «Сямнаццаць імгненняў вясны». Яго савецкі патрыятызм — не дэкларатыўны і таму дзейсны.

Вядома, што паэзія — магутны сродак мастацкага ўздзеяння на моладзь. Таму карысным уяўляецца конкурс вершаў, які можна правесці сярод студэнтаў факультэта пад дэвізам, прыкладам «Скарына, Радзіма, вясна!» у літаратурным клубе БДТУ «Ветліца».

У маладых людзей звычайна існуе патрэба для пераймання, і наша гісторыя пакінула шмат імёнаў, вартых таго. І найбольш яркім з іх ёсць Скарына. Але ж гэта можа быць і жывы чалавек, у ідэале той жа прафесар. Калі ён дасканала валодае прадметам, мае выдатныя маральныя якасці і з'яўляецца патрыётам сваёй краіны, гэта спрацоўвае адназначна.

Хутка 490-лецце беларускага кнігадрукавання. Цяпер ужо ніхто не называе Скарыну манахам, езуітам. Ён глядзіць на нас з глыбі вякоў. І мы гэта выразна адчуваем. Трэба апавядаць пра Скарыну, тлумачыць студэнтам вялікую вартасць культуры. Вучыць паважаць чужое ды любіць сваё — вось мэта ідэйна-патрыятычнага выхавання.

**Літаратура**

1. Баярд Роберт Т., Баярд Джын. Як спраўляцца з праблемамі падлеткаў / Пераклад з англ. Л. С. Марціновіч, Н. А. Мясніковай. — Мн.: Народная асвета, 1990. — 160 с.